**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоцы
_______________ А.В. Данільчанка
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
____________________
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-______/вуч.

**Сучасная беларуская мова**
(назва дысцыпліны)

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

**1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)**

2015 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове АСВА1-21 05 01– 2013, тыпавой вучэбнай праграмы “Сучасная беларуская мова” № ТД-Д. 327/ тып.2015г., вучэбных планаў УВА № Д21-079/вуч. 2013г., УВА № Д21-080/вуч. 2013г., УВА № Д21-081/вуч. 2013г.

СКЛАДАЛЬНІК:

С.А. Важнік, дацэнт кафедры беларускай сучаснай мовы філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(імя, імя па бацьку, прозвішча, пасада, вучоная ступень, вучонае званне)

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай ___________ сучаснай беларускай мовы ___________________
(назва кафедры)
(пратакол № 10 ад _19.05.2015 г.)

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 6 ад _29.06.2015 г.)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны курс сучаснай беларускай мовы на беларускім аддзяленні філалагічных факультэтаў універсітэтаў – гэта цэлы лінгвістычны цыкл, які скіраваны на паглыбленне ведаў студэнтаў-філолагаў пра сістэму беларускай мовы, пашырэнне іх мовазнаўчай дасведчанасці і фарміраванне лінгвістычнага светапогляду. Раздзел «Сінтаксіс» у гэтым цыкле займае адно з важных месцаў і лічыцца ці не самым складаным, бо звязаны з разуменнем працэсу маўлення.

***Мэта*** дысцыпліны "Сучасная беларуская мова" – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў па беларускай мове для агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў, спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў, работнікаў асветы, культуры, друку, навукова-даследчых устаноў Рэспублікі Беларусь, фарміраванне прафесійнай лінгвістычнай кампетэнцыі будучых спецыялістаў-філолагаў.

***Задачы*** дысцыпліны:

- фарміраванне ўсвядомленага разумення студэнтамі аб месцы беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры і духоўным станаўленні нацыі;
- авалоданне лінгвістычнай тэорыяй па сінтаксісе і пунктуацыі;
- выяўленне адметных спецыфічных заканамернасцей, якія праяўляюцца на сінтаксічным ўзроўні;
- усведамленне дынамікі сінтаксічных працэсаў беларускай літаратурнай мовы;
- павышэнне арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці;
- набыццё устойлівых навыкаў самастойнага аналізу лінгвістычных фактаў і з'яў;
- фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў зносін па-беларуску, навыкаў карыстання вусным і пісьмовым маўленнем у сферы працоўнай і прафесійнай дзейнасці, а таксама розных сітуацыях зносін;
- выхаванне ў студэнтаў павагі да беларускага народа як носьбіта беларускай мовы, адчуванне сябе неад'емнай яго часткай;
- выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця нацыянальнай самапавагі, імкнення да далейшага ўзбагачэння лексічных сродкаў беларускай мовы;
- садзейнічанне падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

- змест асноўных лінгвістычных паняццяў;
- сувязь сінтаксіса і пунктуацыі з іншымі раздзеламі мовазнаўства;
- тыпалогію сінтаксічных адзінак;
- асноўныя навуковыя падыходы да вызначэння граматычнай прыроды розных сінтаксічных з'яў;
- працы выбітных беларускіх сінтаксістаў, што стаялі ля вытокаў таго ці іншага падыхода ў сінтакталогіі;
- факты сінтаксічнай адетнасці беларускай мовы ў рускамоўным дачыненні.

***умець:***

- карыстацца лінгвістычнай тэрміналогіяй: дыферэнцыраваць асноўныя моўныя адзінкі;

– характарызаваць моўныя адзінкі з пункту погляду іх семантыкі, структуры і функцыі;
– праводзіць поўны сінтаксічны аналіз словазлучэнняў, простых сказаў, складаных сказаў і ССЦ;
– самастойна працаваць з навукова-даведачнай і метадычнай літаратурай па мовазнаўстве;

***валодаць:***

– нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
– уменнямі праводзіць поўны сінтаксічны разбор розных сінтаксічных адзінак;
– уменнямі аналізаваць фактычны матэрыял;
– уменнямі вызначаць тыпы сінтаксічных адзінак;
– уменнямі расстаўляць знакі прыпынку;
– уменнямі канструяваць тыя ці іншыя сінтаксічныя адзінкі паводле прапанаваных мадэляў;
– уменнямі выкарыстоўваць сінтаксічныя адзінкі ў вусным і пісьмовым маўленні;
– уменнямі генераваць звязныя тэксты рознай стыляў і жанраў у адпаведнасці з сінтаксічнымі і пунктуацыйнымі нормамі СБЛМ; рэдагаваць тэксты.

Абавязковай умовай і неад’емным складнікам сённяшняй універсітэцкай адукацыі з’яўляецца знаёмства студэнтаў з сучасным станам лінгвістычнай навукі і павышэнне іх навукова-тэарэтычнага ўзроўню, на што і скіроўвае складзеная праграма.

Відавочна, што дадзены курс сучаснай беларускай мовы на беларускім аддзяленні шчыльна звязаны з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як “Сінтаксіс рускай мовы” і “ Гістарычны сінтаксіс беларускай мовы”.

Калі ў сучаснай сінтаксічнай навуцы дыскусійнае відавочна дамінуе над агульнапрынятым, то сінтаксічная думка на Беларусі трымаецца, як правіла, у пэўных традыцыйных рамках (прынамсі, выдадзеныя падручнікі па беларускім сінтаксісе не даюць глыбокага ўяўлення пра якія-небудзь спрэчныя і праблемныя моманты). Тым часам у беларускай сінтаксічнай навуцы суіснуюць розныя напрамкі і канцэпцыі, адрозныя гіпотэзы і падыходы.

Менавіта гэтым фактам абумоўлена асноўная задача курса – «вывесці» студэнтаў за рамкі школьнай праграмы, «школьнага» сінтаксісу, а значыць, не толькі апісаць сінтаксічны лад мовы (праз пэўныя дэфініцыі і класіфікацыі), але па магчымасці паказаць станаўленне і развіццё беларускай сінтаксічнай навукі, абапіраючыся на апублікаваныя навуковыя і вучэбныя выданні.

Зразумела, што не ўсе пытанні, якія належыць разглядаць у курсе вышэйшай школы, маюць у сучаснай сінтаксічнай навуцы адназначнае рашэнне, аднак студэнты мусяць ведаць пра розныя пункты гледжання, разбірацца ў іх асноўных палажэннях і мець уласную думку адносна гэтых тэорый. Мэта курса бачыцца ў тым, каб адабраць, сістэматызаваць і данесці да студэнта розныя погляды лінгвістаў на адну і тую ж моўную з’яву, паказаць дыскусійнасць асобных меркаванняў і падыходаў і пры гэтым акрэсліць уласную аўтарскую пазіцыю пры развязванні палемічных пытанняў.

Агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для студэнтаў **3** курса (6 семестр) спецыяльнасці “Беларуская філалогія”, складае **144** гадз.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

Колькасць аўдыторных гадзін складае **64** гадз.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:

24 гадз. – лекцыйных;

32 гадз. – практычных;

8 гадз. – КСР.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## СІНТАКСІС

Прадмет і задачы сінтаксісу. Сінтаксіс сярод лінгвістычных дысцыплін.

Паняцце сінтаксічнай сувязі. Асноўныя віды сінтаксічнай сувязі: злучэнне (паратаксіс) і падпарадкаванне (гіпатаксіс). Асноўныя віды сінтаксічных адносін: прэдыкатыўныя, непрэдыкатыўныя; паратаксічныя, гіпатаксічныя. Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні, простым сказе, складаным сказе.

Паняцце валентнасці, яе тыпы: лагічная, семантычная, сінтаксічная валентнасць; абавязковая (аблігаторная), неабавязковая (факультатыўная) валентнасць. Паняцце дыстрыбуцыі. Валентнасць і дыстрыбуцыя.

Паняцце спалучальнасці. Валентнасць і спалучальнасць. Семантычная, сінтаксічная, лексічная спалучальнасць слоў у беларускай мове. Спалучальнасныя ўласцівасці розных часцін мовы.

Сістэма сінтаксічных адзінак: сінтаксема, словазлучэнне, просты сказ, складаны сказ, складанае сінтаксічнае цэлае (звышфразавае адзінства), тэкст.

Асноўныя аспекты апісання сінтаксісу: структурны, камунікацыйны, функцыянальны, семантычны, структурна-семантычны, прагматычны, стылістычны.

Паняцце нацыянальнай сінтаксічнай ідыяматыкі (канцэпцыя А.Я. Міхневіча).

Сучасная беларуская сінтаксічная навука: актуальны стан, праблемы, канцэпцыі.

## СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Дыферэнцыяльныя прыметы словазлучэння. Адрозненні словазлучэння ад слова і сказа. Будова, значэнне і функцыі словазлучэнняў. Структурная схема і парадыгма словазлучэнняў.

Асноўныя падыходы да разумення граматычнай прыроды словазлучэння. Аб’ём паняцця “словазлучэнне”. Праблема вылучэння прэдыкатыўных і паратаксічных словазлучэнняў.

Класіфікацыя словазлучэнняў у сучаснай лінгвістычнай літаратуры: свабодныя / несвабодныя; прэдыкатыўныя / непрэдыкатыўныя; простыя / складаныя. Лексіка-граматычныя тыпы словазлучэнняў: назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя, дзеяслоўныя і прыслоўныя. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай мове: структура, значэнне, функцыі.

Сінтаксічная сувязь кампанентаў непрэдыкатыўных словазлучэнняў: злучальная (паратаксічная) і падпарадкавальная (гіпатаксічная).

Дыферэнцыяльныя прыметы злучальнай сувязі: адкрытасць / закрытасць. Разнавіднасці злучальнай сувязі: з’яднанне, раз’яднанне, пераразʼяднанне.

Дыферэнцыяльныя прыметы падпарадкавальнай сувязі: прадказальнасць / непрадказальнасць, абавязковасць / неабавязковасць. Разнавіднасці падпарадкавальнай сувязі: дапасаванне (поўнае і няпоўнае); склонавы паралелізм; кіраванне (беспрыназоўнікавае і прыназоўнікавае; моцнае і слабае); прымыканне (уласнае і іменнае). Размежаванне выпадкаў слабага кіравання і іменнага прымыкання. Асаблівасці і нацыянальная адметнасць дапасавання і кіравання ў беларускай літаратурнай мове.

Тыпалогія семантыка-сінтаксічных адносін паміж кампанентамі падпарадкавальнага (гіпатаксічнага) словазлучэння: аб'ектныя, суб'ектныя, азначальныя (атрыбутыўныя), акалічнасныя (сітуацыйныя), камплетыўныя. Сінкрэтызм семантыка-сінтаксічных адносін на ўзроўні падпарадкавальнага словазлучэння. Сродкі выражэння семантыка-сінтаксічных адносін.

Сінтаксічная сінаніміка сучаснай беларускай мовы.

## СКАЗ

Паняцце сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы сказа: камунікацыйнасць, прапазіцыйнасць, прэдыкатыўнасць, граматычная і інтанацыйная аформленасць, сэнсавая закончанасць і самастойнасць. Прэдыкатыўнасць як асноўная сінтаксічная катэгорыя сказа. Субкатэгорыі прэдыкатыўнасці: мадальнасць, тэмпаральнасць, персанальнасць. Монапрэдыкатыўнасць і поліпрэдыкатыўнасць як адрознівальныя прыметы простага і складанага сказа. Простыя поліпрэдыкатыўныя адзінкі.

Граматычнае значэнне і граматычная форма сказа. Паняцце сінтаксічнай мадэлі сказа. Сінтаксічная мадэль і структурная схема сказа. Сінтаксічная парадыгма (сінтаксічнае поле) сказа.

Сінтаксічная сувязь кампанентаў сказа. Разнавіднасці прэдыкатыўнай сувязі: каардынацыя, суразмяшчэнне, прыцягненне. Паўпрэдыкатыўная сувязь. Далучальная сувязь. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі сказа, сродкі іх выражэння і спосабы рэалізацыі ў беларускай мове.

Класіфікацыя сказаў: *паводле будовы* – простыя і складаныя; *паводле мадальнасці* – сцвярджальныя і адмоўныя; *паводле мэты выказвання* – апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя; *паводле інтанацыі* – няклічныя і клічныя; *паводле структурнай арганізацыі* – чляніміыя і нечлянімыя; *паводле колькасці саставаў* – аднасастаўныя і двухсастаўныя; *паводле наяўнасці / адсутнасці пашыральнікаў прэдыкатыўнай асновы сказа* – развітыя і неразвітыя; *паводле наяўнасці / адсутнасці структурна неабходных кампанентаў* – поўныя і няпоўныя; *паводле наяўнасці / адсутнасці элементаў ускладнення* – ускладненыя і няўскладненыя.

Аспекты вывучэння сказа: структурны, семантычны, структурна-семантычны, камунікацыйны, прагматычны і інш.

## ПРОСТЫ СКАЗ

Паняцце простага сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы простага сказа. Просты сказ як монапрэдыкатыўная адзінка. Суадносіны плана зместу (глыбіннай структуры) і плана выражэння (паверхневай структуры) простага сказа.

Фармальная арганізацыя простага сказа. Традыцыйнае вучэнне аб членах сказа. Галоўныя і даданыя члены сказа як канструктыўныя кампаненты фармальнай структуры сказа. Сучасны стан вучэння аб членах сказа. Праблема вылучэння галоўных і даданых членаў сказа ў сучаснай лінгвістыцы. Пашырэнне традыцыйных членаў сказа: сінкрэтычныя члены і дуплексівы, дэтэрмінанты і сітуанты.

Прэдыкатыўная аснова простага сказа. Суадносіны дзейніка і выказніка ў фармальнай структуры сказа. Вербацэнтрычная канцэпцыя сказа. Структурныя тыпы дзейніка і выказніка і спосабы іх выражэння ў сучаснай беларускай мове. Сувязь выказніка з дзейнікам, яе віды і рэалізацыя ў сказе. Праблема аднародных дзейнікаў і выказнікаў.

Даданыя члены сказа: дапаўненне (прамое / ускоснае); азначэнне (дапасаванае / недапасаванае); акалічнасць (месца, часу, прычыны, мэты і пад.). Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя, дэтэрмінаваныя і недэтэрмінаваныя даданыя члены сказа.

Сінкрэтызм у сістэме членаў сказа.

Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў. Фармальная арганізацыя структурнай асновы аднасастаўных сказаў, яе пашырэнне. Традыцыйная класіфікацыя аднасастаўных сказаў, крытэрыі іх размежавання. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы: пэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, няпэўна-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя. Субстантыўныя (дзейнікавыя) сказы: намінатыўныя, назыўныя, вакатыўныя, генітыўныя, канструкцыі з “назоўным уяўлення”. Праблема вылучэння аднасастаўных сказаў (канцэпцыя “аб прынцыповай двухсастаўнасці сказа”). Аднасастаўныя сказы як вынік камунікацыйнай рэалізацыі двухсастаўнай мадэлі. Аднасастаўныя сказы і актуальнае чляненне. Праблема безасабовых сказаў. Структурна-семантычныя разнавіднасці безасабовых сказаў. Размежаванне безасабовых і інфінітыўных сказаў у рэчышчы традыцыйнага беларускага сінтаксісу.

Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структурнай схемы. Ускладненне і катэгорыя прэдыкатыўнасці. Семантычныя і сінтаксічныя аспекты ўскладненых сказаў. Адметныя ўласцівасці ўскладненага сказа на ўзроўні сінтаксічных пазіцый, сінтаксічных сувязяў і сродкаў выражэння. Інтанацыйнае афармленне ўскладнення.

Сказы з аднароднымі членамі: арганізацыя, семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі аднароднага рада, функцыі аднародных членаў сказа. Сінтаксічная сувязь паміж аднароднымі членамі: адкрытая / закрытая, злучнікавая / бяззлучнікавая. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа.

Сказы з адасобленымі членамі сказа. Умовы адасаблення членаў сказа: семантычныя, граматычныя, камунікацыйныя. Сінтаксічная сувязь пры адасабленні: паўпрэдыкатыўная, паясняльная. Тыпы адасобленых кампанентаў.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Структура, тыпы, значэнне, функцыі параўнальных зваротаў у сказе.

Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, іх структура і функцыі. Размежаванне пабочных і ўстаўных канструкцый. Агульнае і адрознае паміж пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

Сказы са звароткам. Структура, функцыі і значэнне звароткa ў сказе.

Сказы з мадальнымі часціцамі і выклічнікамі. Значэнне і функцыі сцвярджальных, адмоўных, пытальных і эмацыянальных слоў у сказе.

Семантычная арганізацыя простага сказа. Паняцце семантычнага сінтаксісу. Намінацыйнае значэнне сказа. Дыктум (прапазіцыі) і модус як два складнікі намінацыйнага значэння сказа. Структура пазамоўнай сітуацыі – семантычная структура сказа. Паняцце прапазіцыі. Тыпы прапазіцый: падзейная (існавання, стану, руху, успрымання, дзеяння) і лагічная (характарызацыі, ідэнтыфікацыі, рэляцыі). Структура прапазіцыі: прэдыкат і актанты (аргументы, семантычныя функцыі, глыбінныя склоны), іх тыпы. Сірканстанты, атрыбуты, іх тыпы. Спосабы выражэння прапазіцыі: праз прэдыкатыўную канструкцыю / праз

непрэдыкатыўную канструкцыю. Паняцце глыбіннага і паверхневага сінтаксісу. Суадносіны глыбіннай і паверхневай структур сказа. Універсальнае і спецыфічнае ў сінтаксічных мадэлях беларускай мовы (пры супастаўленні з рускай і іншымі славянскімі мовамі). Сучасныя напрамкі вывучэння аб'ектыўнага і суб'ектыўнага зместу сказа.

Камунікацыйная арганізацыя простага сказа. Сказ і выказванне. Актуальнае чляненне выказвання. Кампаненты актуальнага чляненння. Сродкі актуальнага чляненння і актуалізацыі выказвання (парадак слоў, інтанацыя, лагічны націск, службовыя словы і інш.). Парадак слоў і актуальнае чляненне. Прамы і адваротны (інверсійны) парадак размяшчэння кампанентаў у выказванні. Спосабы выражэння тэмы і рэмы ў простым сказе. Камунікацыйная парадыгма сказа. Асноўныя камунікацыйна-сінтаксічныя тыпы выказванняў у беларускай мове. Тыпалогія выказванняў: нейтральныя / экспрэсіўныя, расчлянёныя / нерасчлянёныя (з нулявой тэмай), сінтагматычна незалежныя / сінтагматычна залежныя (абумоўленыя).

Суадносіны камунікацыйнага і фармальна-сінтаксічнага чляненняў выказвання.

Прагматычны аспект. Выказванне, сітуацыя і моўца. Камунікацыйная інтэнцыя (прагматычная функцыя) выказвання. Паняцце лакутыўных, ілакутыўных і перлакутыўных маўленчых актаў.

Прагматычныя тыпы выказванняў: сцвярджэнне, абяцанне, пагроза, пабуджэнне (загад, просьба), пытанне і інш. Прамыя і ўскосныя маўленчыя акты.

## ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОГА ПРАЕКТА

Працэсу паглыблення, засваення і замацавання атрыманых ведаў па курсе “Сучасная беларуская мова” садзейнічае напісанне курсавой работы, якая з’яўляецца адной з важных форм падрыхтоўкі спецыяліста-філолага з вышэйшай адукацыяй.

*Мэта* напісання курсавой работы – паглыбіць і ўдасканаліць навыкі самастойнай даследчыцкай працы, выявіць уменне выкарыстоўваць атрыманыя веды для рашэння пэўных лінгвістычных задач па абранай, развіваць пазнавальнае лінгвістычнае мысленне.

У працэсе працы над курсавой работай студэнт павінен прадэманстраваць наступныя *ўменні*:

- абгрунтоўваць актуальнасць, навізну і практычную значнасць праблемы;
- працаваць з навуковай літаратурай, прадэмастраваць узровень лінгвістычнай дасведчанасці па праблеме, уменне аперыраваць лінгвістычнымі тэрмінамі і паняццямі;
- выбіраць, класіфікаваць і аналізаваць фактычны матэрыял, абагульняць назіранні над ім, рабіць вывады;
- раскрыць змест даследаванай тэмы, праблемы ў сістэматызаванай і паслядоўнай форме;
- выявіць культуру навуковага выкладу тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу;
- выпрацоўка ўменне лагічна, паслядоўна і доказна фармуляваць свае меркаванні, назіранні і вывады па даследуемай праблеме;
- выпрацоўка ўменне публічнага выступлення, навуковай дыскусіі і абароны;
- падрыхтоўка да вырашэння выніковай задачы спецсемінара – выканання дыпломнай работы.

Асноўны змест курсавой работы складае аналіз і ацэнка сабранага і прыведзенага ў сістэму матэрыялу, выяўленне характэрнага і спецыфічнага ў ім.

Паводле характару апрацоўкі сабранага фактычнага матэрыялу курсавая работа можа мець аналітычны ці рэфератыўны характар. Работы аналітычнага характару патрабуюць самастойнага рашэння пастаўленай лінгвістычнай задачы. Вырашальным пры іх напісанні выступае ўменне раскласіфікаваць, сістэматызаваць і апісаць фактычны матэрыял у абраным аспекце даследавання. Рэфератыўны характар курсавой работы мае на мэце апісанне дыскусійных і спрэчных пытанняў мовазнаўства. Пры гэтым сутнасным становіцца ўменне адабраць і сістэматызаваць матэрыял, асэнсаваць моўныя канцэпцыі, ідэі, кірункі лінгвістычных школ, асобных даследчыкаў, аб’ектыўна ацаніць ужо зробленае, а таксама акрэсліць свой пункт гледжання на даследуемую праблему.

Вывучэнне навуковай літаратуры студэнтам не павінна абмяжоўвацца толькі напрацоўкамі беларускай і рускай лінгвістыкі, а па меры даступнасці і магчымасці вывучаць навуковую літаратуру іншых славянскіх моў.

Незалежна ад характару работы студэнт праходзіць усе неабходныя этапы даследніцкай дзейнасці: падбор навуковай літаратуры па тэме даследавання, асэнсаванне кірункаў даследавання, сістэматызацыя фактычнага матэрыялу, складанне плана даследавання, акрэсліванне цэласнай кампазіцыі работы.

На выкананне курсавой работы адводзіцца 8 гадз.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

## ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА”
## для спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках))

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў для вывучэння | Колькасць аўдыторных гадзін | | | колькасць гадзін кіруемай самастойнай работы студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Сінтаксіс словазлучэння і простага сказа** | **24** | **32** | | **8** | | | |
| **1.** | **Сінтаксіс як раздзел апісальнай граматыкі** | **2** | | | | | | |
| 1.1. | 1. Прадмет і задачы сінтаксісу. Сінтаксіс сярод лінгвістычных дысцыплін.<br>2. Паняцце сінтаксічнай сувязі і сродкаў яе выражэння.<br>3. Сістэма сінтаксічных адзінак.<br>4. Асноўныя аспекты апісання сінтаксісу.<br>5. Сучасная беларуская сінтаксічная навука: актуальны стан, праблемы, канцэпцыі. | | | | | Электронны падручнік | [1], [3], [7], [9], [11], [15], [17] | |
| **2.** | **Словазлучэнне** | **4** | **8** | | **2** | | | |
| 2.1 | 1. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.<br>2. Дыферэнцыяльныя прыметы словазлучэння.<br>3. Структурная схема і парадыгма словазлучэнняў.<br>4. Асноўныя падыходы да разумення | 2 | | | | Электронны падручнік | [4], [8], [7], [9], [10], [17], [20], [22] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | граматычнай прыроды словазлучэння.<br>5. Класіфікацыя словазлучэнняў у сучаснай лінгвістычнай літаратуры | | | | | | | Пісьмовая работа |
| 2.1.2 | 1. Словазлучэнні свабодныя / несвабодныя, прэдыкатыўныя / непрэдыкатыўныя; простыя / складаныя.<br>2. Лексіка-граматычныя тыпы словазлучэнняў: назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя, дзеяслоўныя і прыслоўныя.<br>3. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай мове: структура, значэнне, функцыі. | | 2 | | | ВМК | [1], [4], [7], [10], [14], [17], [20], [22] | Камп'ютар. тэсты |
| 2.1.3 | 1. Сінтаксічная сувязь кампанентаў непрэдыкатыўных словазлучэнняў: злучальная і падпарадкавальная.<br>2. Тыпалогія семантыка-сінтаксічных адносін паміж кампанентамі падпарадкавальнага (гіпатаксічнага) словазлучэння.<br>3. Сінтаксічная сінаніміка сучаснай беларускай мовы. | 2 | 2 | | | Электронны падручнік | [1], [4], [7], [10], [14], [17], [20], [22] | |
| 2.1.4 | 1. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальнага словазлучэння.<br>2. Тыпы сувязі ў словазлучэннях: дапасаванне, кіраванне, прымыканне. | | 4 | | 2 | ВМК | [4], [5], [7], [10], [14], [17], [18], [21] | Камп'ютарныя тэсты |
| **3.** | **Просты сказ** | **18** | **24** | | **2** | | | |
| 3.1 | 1. Паняцце сказа. Дыферэнцыяльныя прыметы сказа.<br>2. Прэдыкатыўнасць як асноўная сінтаксічная катэгорыя сказа.<br>3. Узроўні аналізу сказа: прагматычны, камунікацыйны, семантычны і сінтаксічны. | 2 | | | | | [2], [3], [7], [11], [18], [19], [21], [22] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Сінтаксічная парадыгма, ці сінтаксічнае поле сказа. | | | | | | | |
| 3.2 | **Сінтаксічны (фармальны) аспект** | **2** | **8** | | | | | |
| 3.2.1. | 1. Мадэль сказа і структурная схема (мінімальная і пашыраная).<br>2. Сінтаксічныя мадэлі сучаснай беларускай мовы. Сінтаксічная аманімія.<br>3. Структурнае ядро сказа. Паняцце функцыянальна-сінтаксічнай пазіцыі. Пазіцыя дзейніка і выказніка.<br>4. Вербацэнтрычная тэорыя арганізацыі выказвання і апазіцыйныя канцэпцыі. | 2 | | | 2 | Электронны падручнік | [1], [4], [5], [8], [9], [16], [21], [22] | Камп’ю тарныя тэсты |
| 3.2.2. | 1. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа.<br>2. Дзейнік, спосабы яго выражэння ў сказе.<br>3. Выказнік, яго структурныя тыпы і адметнасці выражэння.<br>4. Праблема дапасавання выказніка да колькаснага дзейніка. | | 4 | | | ВМК | [1], [4], [5], [8], [9], [16], [21], [22] | |
| 3.2.3. | 1. Традыцыйная тэорыя даданых членаў сказа.<br>2. Азначэнне і прыдатак, спосабы выражэння ў сказе.<br>3. Дапаўненне і спосабы іх выражэння ў сказе.<br>4. Акалічнасць і спосабы іх выражэння ў сказе.<br>5. Пашырэнне паняцця традыцыйных членаў сказа. | | 4 | | | | [1], [4], [5], [8], [9], [16], [18], [19], [21], [22] | Пісьмо вая работа |
| 3.3. | **Аднасастаўныя сказы** | **4** | **4** | | **2** | | | |
| 3.3.1 | 1. Лінгвістычны статус аднасастаўных сказаў.<br>2. Фармальная арганізацыя структурнай асновы аднасастаўных сказаў, яе пашырэнне.<br>3. Праблема вылучэння аднасастаўных сказаў. | 2 | | | | Вучэбны дапаможнік | [11], [6], [4], [10], [17], [18], [19], [22] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3.2 | 1. Традыцыйная класіфікацыя аднасастаўных сказаў, крытэрыі іх размежавання.<br>2. Субстантыўныя (дзейнікавыя) сказы: намінатыўныя, назыўныя, вакатыўныя, генітыўныя, канструкцыі з “назоўным уяўлення”. | | 2 | | | ВМК | [4], [6], [10], [11], [17], [18], [19], [22] | |
| 3.3.3 | 1. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы:<br>2. Праблема безасабовых сказаў. Структурна-семантычныя разнавіднасці безасабовых сказаў.<br>3. Размежаванне безасабовых і інфінітыўных сказаў у рэчышчы традыцыйнага беларускага сінтаксісу. | 2 | 2 | | 2 | | [1], [4], [6], [10], [11], [17], [18], [19], [22] | Вуснае апытан не |
| 3.4 | **Ускладненне простага сказа** | **2** | **6** | | **2** | | | |
| 3.4.1. | 1. Ускладненне простага сказа як спосаб пашырэння яго структурнай схемы.<br>2. Адметныя ўласцівасці ўскладненага сказа на ўзроўні яго сінтаксічных пазіцый, сінтакічных сувязяў і сродкаў выражэння.<br>3. Тыпы ўскладнення. | 2 | | | | | [7], [1], [3], [6], [4], [8], [18], [21] | Камп’ю тарныя тэсты |
| 3.4.2. | 1. Сказы з аднароднымі членамі: арганізацыя, семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі аднароднага рада, функцыі.<br>2. Сінтаксічная сувязь паміж аднароднымі членамі: адкрытая / закрытая, злучнікавая / бяззлучнікавая.<br>3. Роля абагульняльных слоў пры аднародным радзе і спосабы іх выражэння. | | 2 | | | Вучэбны дапаможнік | [1], [4], [5], [7], [8], [16], [18], [21], [22] | |
| 3.4.3. | 1. Сказы з адасобленымі членамі сказа.<br>2. Умовы адасаблення членаў сказа.<br>3. Сінтаксічная сувязь пры адасабленні (паўпрэдыкатыўная, паясняльная) і тыпы | | 2 | | | ВМК | [1], [4], [5], [7], [8], [16], [18], [21], [22] | Праме жкавы |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | адасобленых членаў. | | | | | | | залік |
| 3.4.4. | 1. Параўнальныя звароты: тыпы, структура, сувязь у сказе.<br>2. Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі: структура і функцыі. Агульнае і адрознае паміж пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.<br>3. Сказы са звароткам: структура і функцыі ў сказе. | | 2 | | 2 | | [1], [4], [5], [7], [8], [16], [18], [21], [22] | Пісьмо вая работа |
| 3.5. | **Камунікацыйны аспект простага сказа** | **4** | **2** | | | | | |
| 3.5.1. | 1. Паняцце камунікацыйнай перспектывы выказвання. 2. Суаднесенасць камунікацыйнага і фармальна-сінтаксічнага члянення выказвання.<br>3. Тыпалогія выказванняў: нейтральныя / экспрэсіўныя, расчлянёныя / нерасчлянёныя, сінтагматычна незалежныя / сінтагматычна залежныя. | 2 | | | | Электронны падручнік | [2], [3], [4], [6], [9], [17], [19], [22] | |
| 3.5.1. | 1. Сродкі актуальнага члянення (АЧ): інтанацыя, парадак слоў.<br>2. Тыпы інтанацыйных канструкцый (ІК) у сучаснай беларускай мове.<br>3. Парадак слоў і АЧ. Прамы і адваротны (інверсійны) парадак размяшчэння сінтаксем у выказванні. | | 2 | | | Вучэбны дапаможнік | [2], [3], [4], [6], [9], [17], [19], [22] | Калёкві ум |
| 3.5.2. | 1. Актуальнае чляненне і актуалізацыя.<br>2. Сродкі актуалізацыі ў вусным маўленні (прасадычныя) і пісьмовым тэксце (графічныя).<br>3. Лексічныя, лексіка-граматычныя, сінтаксічныя актуалізатары (паўтор, часціцы, злучнікі, парцэляты, далучэнне, намінатыўны тэмы і інш.). | 2 | | | | | [2], [3], [6], [17], [19], [22] | |
| 3.6 | **Семантычны і прагматычны аспекты** | **4** | **2** | | | | | |
| 3.6.1 | 1. Сінтаксіс і семантыка. Прапазіцыйная функцыя | 2 | 2 | | | | [2], [3], [4], | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | сказа.<br>2. Сучасныя кірункі ў вывучэнні семантыкі сказа.<br>3. Паняцце глыбіннага і паверхневага сінтаксісу.<br>4. Семантычны узровень як інтэрпрэтацыя зместу (дэнататыўнага) сказа.<br>5. Тыпавая сітуацыя і прапазіцыя. Тыпы прапазіцый. | | | | | | [9], [11], [12], [15], [19] | |
| 3.6.2. | 1. Прэдыкатна-актантная структура прапазіцыі.<br>2. Класіфікацыя актантаў паводле іх ролі ў структуры прапазіцыі.<br>3. Прапазіцыя (дыктум) і модус.<br>4. Катэгорыя модусу, спосабы і сродкі яе выражэння ў выказванні. | 2 | 2 | | | | [2], [3], [4], [9], [11], [12], [15], [19] | Вуснае апытанне |
| | | | | | | | | Экзамен |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

| № п/п | ***Асноўная літаратура*** | Год выдання |
|---|---|---|
| 1. | Беларуская граматыка: Сінтаксіс. Ч. 2. | Мн., 1986. |
| 2. | Беларуская мова: хрэстаматыя: вучэб. дапам. | Мн., 2005. |
| 3. | Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. | Мн., 1994. |
| 4. | *Бурак Л. І.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя. | Мн., 1987. |
| 5. | *Бурак Л.І., Бурак І.Л.* Сучасная беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя. Практыкум. | Мн., 1993. |
| 6. | *Выгонная Л.Ц.* Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. | Мн., 1991. |
| 7. | Граматыка беларускай мовы: Сінтаксіс. Ч. 2. | Мн., 1966. |
| 8. | *Клюсаў Г.Н.* Асновы і нормы сучаснай беларускай пунктуацыі. | Гродна, 1993. |
| 9. | *Лепешаў І.Я.* Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. | Гродна, 2002. |
| 10. | *Маршэўская В.В.* Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс: Дапаможнік. | Гродна, 2008. |
| 11. | *Міхневіч А.Я.* Выбраны працы. | Мн., 2006. |
| 12. | *Міхневіч А.Я.* Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. | Мн., 1976. |
| 13. | *Міхневіч А.Я.* Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове. | Мн., 1965. |
| 14. | *Наркевіч А.І.* Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове (структурна-семантычнае апісанне). | Мн., 1972. |
| 15. | *Падлужны А.І.* Мова і грамадства. | Мн., 1997. |
| 16. | Пунктуацыя: кароткі комплексны дапам.-давед. | Мн., 2006. |
| 17. | *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый. | Мн., 2002. |
| 18. | *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Практычныя курс: Вучэб. дапаможнік. | Мн., 2008. |
| 19. | *Рамза Т.Р.* Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік. | Мн., 2006. |
| 20. | Словазлучэнне: нарматыўныя аспекты ўтварэння і ўжывання / А.Я. Міхневіч, Т.Р. Рамза. | Мн., 2005. |
| 21. | *Сямешка Л. І., Шкраба І. Р., Бадзевіч З. І.* Курс беларускай мовы. | Мн., 1996. |
| 22. | *Чалюк Н. М.* Сінтаксіс. Словазлучэнне. Просты сказ: Вучэб. дапам. | Мн., 2004. |

**ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ**
**для студэнтаў**
**спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)**

| № п/п | Тэмы практычных заняткаў | Колькасць гадз. |
|---|---|---|
| 1. | Тыпы словазлучэнняў. | **2** |
| 2. | Сінтаксічная сувязь кампанентаў словазлучэнняў. | **2** |
| 3. | Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальнага словазлучэння | **4** |
| 4. | Галоўныя члены сказа. | **4** |
| 5. | Даданыя члены сказа. | **4** |
| 6. | Класіфікацыя аднасастаўных сказаў. | **2** |
| 7. | Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы. | **2** |
| 8. | Сказы з аднароднымі членамі. | **2** |
| 9. | Сказы з адасобленымі членамі сказа. | **2** |
| 10. | Параўнальныя звароты, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, звароткі | **2** |
| 11. | Актуальнае чляненне выказвання. | **2** |
| 12. | Семантычны сінтаксіс. | **2** |
| 13. | Тыпалогія прэдыкатаў і актантаў. | **2** |
| | **Усяго гадзін:** | **32** |

## ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
### для студэнтаў спецыяльнасці
### 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)

### Сінтаксіс словазлучэння і простага сказа.

**1. Тыпы словазлучэнняў – бел. філ 2 гадз.**

1. Словазлучэнні свабодныя / несвабодныя, прэдыкатыўныя / непрэдыкатыўныя; простыя / складаныя.
2. Лексіка-граматычныя тыпы словазлучэнняў: назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя, дзеяслоўныя і прыслоўныя.
3. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай мове: структура, значэнне, функцыі.

**2. Сінтаксічная сувязь кампанентаў словазлучэнняў – бел. філ. 2 гадз.**

1. Сінтаксічная сувязь кампанентаў непрэдыкатыўных словазлучэнняў: злучальная і падпарадкавальная.
2. Тыпалогія семантыка-сінтаксічных адносін паміж кампанентамі падпарадкавальнага (гіпатаксічнага) словазлучэння.
3. Сінтаксічная сінаніміка сучаснай беларускай мовы.

**3. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальнага словазлучэння – бел. філ. 4 гадз.**

1. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальнага словазлучэння.
2. Тыпы сувязі ў падпарадкавальных словазлучэннях: дапасаванне, кіраванне, прымыканне.
3. Склонавы паралелізм як адмысловая разнавіднасць дапасавання.

**4. Галоўныя члены сказа.– бел. філ. 4 гадз.**

1. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа.
2. Дзейнік, спосабы яго выражэння ў сказе.
3. Выказнік, яго структурныя тыпы і адметнасці выражэння.
4. Праблема дапасавання выказніка да колькаснага дзейніка.

**5. Даданыя члены сказа – бел. філ. 4 гадз.**

1. Традыцыйная тэорыя даданых членаў сказа.
2. Азначэнне і прыдатак, спосабы выражэння ў сказе.
3. Дапаўненне і спосабы іх выражэння ў сказе.
4. Акалічнасць і спосабы іх выражэння ў сказе.
5. Пашырэнне паняцця традыцыйных членаў сказа.

**6. Класіфікацыя аднасастаўных сказаў.– бел. філ. 2 гадз.**

1. Традыцыйная класіфікацыя аднасастаўных сказаў, крытэрыі іх размежавання.
2. Субстантыўныя (дзейнікавыя) сказы:
намінатыўныя, назыўныя, вакатыўныя, генітыўныя, канструкцыі з “назоўным уяўлення”.

**7. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы. – бел. філ. 2 гадз.**

1. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы.
2. Праблема безасабовых сказаў. Структурна-семантычныя разнавіднасці безасабовых сказаў.
3. Размежаванне безасабовых і інфінітыўных сказаў у рэчышчы традыцыйнага беларускага сінтаксісу.

**8. Сказы з аднароднымі членамі – бел. філ. 2 гадз.**

1. Сказы з аднароднымі членамі: арганізацыя, семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі аднароднага рада, функцыі.
2. Сінтаксічная сувязь паміж аднароднымі членамі: адкрытая / закрытая, злучнікавая / бяззлучнікавая.
3. Роля абагульняльных слоў пры аднародным радзе і спосабы іх выражэння.

**9. Сказы з адасобленымі членамі сказа – бел. філ. 2 гадз.**

1. Сказы з адасобленымі членамі сказа.
2. Умовы адасаблення членаў сказа.
3. Сінтаксічная сувязь пры адасабленні (паўпрэдыкатыўная, паясняльная) і тыпы адасобленых членаў.

**10. Параўнальныя звароты, пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, звароткі – бел. філ. 2 гадз.**

1. Параўнальныя звароты: тыпы, структура, сувязь у сказе.
2. Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі: структура і функцыі. Агульнае і адрознае паміж пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.
3. Сказы са звароткам: структура і функцыі ў сказе.

**11. Актуальнае чляненне выказвання – бел. філ. 2 гадз.**

1. Сродкі актуальнага чляпення (АЧ): інтанацыя, парадак слоў.
2. Тыпы інтанацыйных канструкцый (ІК) у сучаснай беларускай мове.
3. Парадак слоў і АЧ. Прамы і адваротны (інверсійны) парадак размяшчэння сінтаксем у выказванні.

**12. Семантычны сінтаксіс – бел. філ. 2 гадз.**

1. Сінтаксіс і семантыка. Прапазіцыйная функцыя сказа.
2. Сучасныя кірункі ў вывучэнні семантыкі сказа.
3. Паняцце глыбіннага і паверхневага сінтаксісу.
4. Семантычны узровень як інтэрпрэтацыя зместу (дэнататыўнага) сказа.
5. Тыпавая сітуацыя і прапазіцыя. Тыпы прапазіцый.

**13. Тыпалогія прэдыкатаў і актантаў – бел. філ. 2 гадз.**

1. Прэдыкатна-актантная структура прапазіцыі.
2. Класіфікацыя актантаў паводле іх ролі ў структуры прапазіцыі.
3. Прапазіцыя (дыктум) і модус.
4. Катэгорыя модусу, спосабы і сродкі яго выражэння ў выказванні.

# ТЭМАТЫКА КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ
## для студэнтаў спецыяльнасці
## 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)

**№ 1. <u>КСРС</u>.**
**Тэма: Словазлучэнне**

**Пытанні**

1. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.
2. Дыферэнцыяльныя прыметы словазлучэння.
3. Структурная схема і парадыгма словазлучэнняў.
4. Асноўныя падыходы да разумення граматычнай прыроды словазлучэння.
5. Класіфікацыя словазлучэнняў у сучаснай лінгвістычнай літаратуры
6. Семантыка-сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі падпарадкавальнага словазлучэння.
7. Тыпы сувязі ў словазлучэннях: дапасаванне, кіраванне, прымыканне.

**Літаратура**

1. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.
2. Рамза Т.Р. Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый. Мн., 2002.
3. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Практычныя курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2008.
4. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2006.
5. Словазлучэнне: нарматыўныя аспекты ўтварэння і ўжывання / А.Я. Міхневіч, Т.Р.Рамза. Мн., 2005.

**№ 2. <u>КСРС.</u>**
**Тэма: Фармальная арганізацыя простага сказа**

**Пытанні**

1. Мадэль сказа і структурная схема (мінімальная і пашыраная).
2. Сінтаксічныя мадэлі сучаснай беларускай мовы. Сінтаксічная аманімія.
3. Структурнае ядро сказа. Паняцце функцыянальна-сінтаксічнай пазіцыі. Пазіцыя дзейніка і выказніка.
4. Вербацэнтрычная тэорыя арганізацыі выказвання і апазіцыйныя канцэпцыі.
5. Галоўныя члены сказа, іх структурныя тыпы.
6. Даданыя члены сказа, тыпалогія.

**Літаратура**

1. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.
2. Рамза Т.Р. Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый. Мн., 2002.
3. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Практычныя курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2008.
4. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2006.

**№ 3. <u>КСРС.</u>**
**Тэма: Дзеяслоўна-адвербіяльныя і субстантыўныя сказы**

**Пытанні**

1. Дзеяслоўна-адвербіяльныя (выказнікавыя) сказы:
2. Праблема безасабовых сказаў. Структурна-семантычныя разнавіднасці безасабовых сказаў.
3. Размежаванне безасабовых і інфінітыўных сказаў у рэчышчы традыцыйнага беларускага сінтаксісу.
4. Субстантыўныя (дзейнікавыя) сказы.

**Літаратура**

1. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.
2. Рамза Т.Р. Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый. Мн., 2002.
3. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Практычныя курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2008.
4. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2006.

**№ 4. КСРС.**
**Тэма: Ускладненне простага сказа**

**Пытанні**

1. Аднародныя члены сказа.
2. Адасобленыя члены сказа.
3. Параўнальныя звароты.
4. Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі: агульнае і адметнае.
5. Сказы са звароткамі.

**Літаратура**

1. Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.
2. Рамза Т.Р. Сінтаксіс. Просты сказ: Курс лекцый. Мн., 2002.
3. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Практычныя курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2008.
4. Рамза Т.Р. Сінтаксіс: Тэарэтычны курс: Вучэб. дапаможнік. Мн., 2006.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ
## ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
## “СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА”
## ( СІНТАКСІС СЛОВАЗЛУЧЭННЯ І ПРОСТАГА СКАЗА)

Выкарыстанне ў адукацыйным працэсе комплексных тэставых заданняў забяспечвае засваенне студэнтамі спецыфікі вучэбна-даследчай дзейнасці на розных ўзроўнях, што дазваляе эфектыўна дыягнаставаць фарміруемыя лінгвістычныя кампетэнцыі.

**Тэма *“Словазлучэнне”*.**

*Вызначыць характар семантыка-сінтаксічных адносінаў і від сувязі.*

1) адшукаць дзякуючы вучоным
2) ніхто з прахожых
3) нешта радаснае
4) колер хакі
5) сігнал дзейнічаць
6) сны аб Беларусі
7) дзякую настаўніку
8) цёмны пад снегам
9) возера Нарач
10) глядзець тэлевізар
11) двойчы два
12) дарога між бярозамі
13) тры сталы
14) пяці сталоў
15) поўны хараства
16) загад дэкана
17) рады ад душы
18) зрабіць у тэрмін
19) ісці ў тэатр
20) чатыры сястры
21) выбраць старасту
22) чытаць начамі
23) прыгожыя мясціны
24) прытуліць да грудзей
25) дуб-волат

**Тэма *“Просты сказ”*.**

*Вызначыць поўныя / няпоўныя* і *развітыя / неразвітыя сказы.*

1) Над намі – зорнае неба.
2) Птушка рада вясне, а дзіця – мацеры.
3) Заўсёды наперад! Ніколі назад!
4) Снежна. Сонна. Свежа.
5) Яблык зялёны.

6) Ды галавы ён не вешаў…
7) Не адмёрз ледзь нос, што цалаваў… мароз.
8) Дзе прайшло маленства, там пачынаецца радзіма.
9) Халодныя ночы.
10) Ранак. Натоўп прыгожых думак.
11) Хто там? – Ваш сусед!
12) Заходзіла сонца. Вялікае, барвовае, спакойнае.
13) Мінулі восень і зіма.
14) Было зусім ціха. Распагодзілася.
15) Люблю народ наш беларускі.
16) На вуліцах – гоман.
17) Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
18) Забраць кулямёты! За мной!
19) У Забалоцці днее.
20) За дарогай адразу кусцікі, хвойнікі, ядловец.
21) Чалавек славіцца не языком, а розумам.
22) Не кажы мне “бывай”, “да спаткання” кажы.
23) Гаспадыня вельмі стамілася, аднак – усміхаецца.
24) І дзядзька быў рыбак выдатны…
25) З двара пазірала цёмная чорная ноч.

**Тэма** ***“Прэдыкатыўная аснова простага сказа.”***

*Вызначыць структурныя тыпы дзейнікаў і выказнікаў.*

1) Снег усюды белы, сыпкі.
2) А людзі ж усякія ёсць.
3) Марыя Іванаўна старалася ўзяць сябе ў рукі.
4) А ночы ў нас зорныя.
5) Начаваць ён меўся пайсці да Андрэя.
6) І раптам – бліснь у небе агеньчык.
7) Пушыста ўецца-сцелецца густая дзераза.
8) Якаў возьме ды забярэ сваю частку гаспадаркі.
9) Ганна аж прасці перастала.
10) Узнімаўся вецер, змрок пачаў рабіцца яснейшым.
11) Людзі хацелі выйсці жывымі і здаровымі з пекла вайны.
12) Пасля дажджу лес зрабіўся панурым і непрытульным.
13) Я хацеў бы, каб весела прайшлі іх гады.
14) Хлопчык з нямецкай блакады быў вырвацца рады.
15) Яна ў мяне ахвотніца гасцяваць.
16) З вечара было зорна.
17) Майстар быў дзяцюк есці гэтыя абаранкі.
18) Яна за гаспадыню.
19) Сяброўства павінна быць вялікім і вечным.
20) Ехаць у кабіне лейтэнант адмовіўся.

**Тэма** ***“Аднасастаўныя сказы”.***

*Вызначыць разнавіднасць аднасастаўных сказаў.*

1) Так, відаць, бывае з кожным: адлучышся на якія тры дні з дому і ўжо думаеш, што там многае змянілася.
2) У дзверы пакоя нясмела пастукалі.
3) Пачатак лістапада. Вечар. Ціха і глуха.
4) А птушак, птушак!
5) Век жыць вам у сэрцы народа, героі.
6) Іду і хочацца сказаць: якая прыгажосць!
7) Мінск… Чарняўскі думкамі быў ужо ў Мінску.
8) Глянь на зямлю залатую, пяшчотную, сумную, чыстую.
9) Не злічыць у небе ясных зорак, не злічыць у сэрцы ясных дум.
10) “Эх, Зося! – так Янка гаворыць бывала: за што мяне шчасце такое спаткала!”
11) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
12) Не пазнаць, Беларусь, цябе сёння.
13) Ад гумен пахла ржанымі снапамі.
14) Спявалі недзе ў дальнім канцы вёскі.
15) Камандзіра дывізіі паклікалі да тэлефона.
16) Заснуць у гэту ноч не прыйшлося.
17) На белым свеце людзей многа, і, мабыць, да кожнага чалавека трэба мець спагаду.
18) Мне б самому пазнаць свет пуцінамі рознымі.
19) Сюды не трапіць палахлівы, тут жыць бы грознаму арлу!
20) Ноччу нічога не ўбачаць.

**Тэма *“Поўны сінтаксічны разбор”.***

*Зрабіць поўны сінтаксічны разбор простых прэдыкатыўных частак.*

1) Паэзія здольна “фіксаваць” работу душы, якая спасцігае свет.
2) Якое поле, такі і ўраджай.
3) Я чую начамі, як студзеньскі вецер то вые, то снегам шуміць па сцяне.
4) Хто позна ўстае, той хлеба не дастае.
5) Было відаць, што дождж ужо лінуў на захадзе.
6) І гэта ўсё, што вы змаглі прывесці ў доказ?
7) Я казку ведаю адну, што мела месца ў нашым краі.
8) Стаяла яблыня ля вёскі, як падарожнік між дарог.
9) Маладзец, Ігнат, што сказаў.
10) Я хачу, каб у нашы гады ўсе былі маладымі.
11) У вачах адлюстроўваецца тое, што ў душы хаваецца на дне.
12) Горай не будзе, бо лепш не было.
13) Тыя, што перамагаюць самі сябе, змагаюцца ўсё жыццё.
14) Дзе прайшло маленства, там пачынаецца радзіма.
15) У пшаніцы, якая даходзіць да самага вішняку, стракочуць конікі.
16) Усё, пра што нам марыцца, збываецца ў жыцці.
17) У цішыні чуваць было, як асыпаюцца кропелькі расы з лісця кустоў.
18) Край мой там, дзе Нёман льецца срэбна-плынным паласой.
19) Некаторым не дае заснуць думка, што іншыя не дрэмлюць.
20) Тут было столькі прастору, колькі жадала яго душа.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца, выбіраюцца і адаптуюцца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі спецыялістаў.

Асноўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца:

- выкананне прамежкавых тэстаў;
- распрацоўка індывідуальных і калектыўных навукова-творчых заданняў і праектаў;
- падрыхтоўка і ўдзел у правядзенні такіх актыўных форм навучання, як дыскусіі і дэбаты па складаных і спрэчных пытаннях у лінгвістыцы;
- вывучэнне студэнтамі навукова-метадычных артыкулаў па праблемах беларускага і замежнага мовазнаўства, іх анатаванне і рэцэнзаванне;
- падрыхтоўка навуковых матэрыялаў, дакладаў, навукова-даследчых работ для ўдзелу ў студэнцкіх навукова-практычных канферэнцыях, конкурсах;
- самакантроль шляхам выканання трэніровачных (у тым ліку камп'ютарных) тэстаў і заданняў;
- індывідуальныя кансультацыі з выкладчыкам.

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ІНАВАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ ДА ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Метады інавацыйнага навучання:

- метад праблемнай нагляднасці;
- метад лінгвістычнай алюзіі;
- метад актывізацыі асацыятыўных сувязей і інш.

Прыёмы работы на аўдыторных занятках:

- асацыятыўны;
- прыём складання тэматычнай сеткі,
- прыёмы складання схем.
- лінгвадыдактычная дыскусія, дыспут і інш.

Матэрыяльна-дыдактычны бок інавацыйных тэхналогій звязаны з новай функцыяй лінгвістычнай нагляднасці, якая забяспечвае кіраванне пазнаваўчай дзейнасцю студэнтаў праз апарат эмоцый.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Сучасная беларуская мова” выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытванне падчас заняткаў;
- пісьмовыя кантрольныя работы;
- камп’ютарныя тэсты;
- пісьмовыя работы (дыктанты, пераклады);
- адзнака па практычных занятках;
- выніковае тэсціраванне;
- прамежкавыя формы атэстацыі (прамежкавы залік);
- выніковыя формы атэстацыі (экзамен).

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. вусная форма;
2. пісьмовая форма;
3. вусна-пісьмовая форма;

Да *вуснай* формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. вуснае апытванне;
2. даклады на практычных занятках;
3. даклады на канферэнцыях;
4. тэсты.

Да *пісьмовай* формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. тэсты;
2. кантрольныя апытванні.
3. публікацыі артыкулаў, дакладаў;
5. ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.

Да *вусна-пісьмовай* формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. залікі;
2. экзамены;
3. абарона дыпломнай работы.
4. ацэньванне на аснове модульна-рэйтынгавай сістэмы.

Да *тэхнічнай* формы дыягностыкі кампетэнцый адносяцца:

1. электронныя тэсты;

Асноўным сродкам дыягностыкі засваення ведаў і авалодання неабходнымі ўменнямі і навыкамі па дысцыпліне з'яўляюцца: праверка заданняў рознага тыпу (рэпрадуктыўных, рэканструктыўных, варыятыўных), камп’ютарнае тэсціраванне, кансультацыя, гутарка, пісьмовая работа, франтальнае апытванне.

З мэтай бягучага кантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па дысцыпліне выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

- выбарачнае апытванне;
- праверка канспектаў лекцый студэнтаў;
- правядзенне КСР, пісьмовых работ;
- падрыхтоўка прэзентацый;
- індывідуальныя заданні;
- тэсціраванне, у тым ліку камп’ютарнае.

## ПАТРАБАВАННІ ДА СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Ацэнка ведаў студэнтаў на працягу семестра (вучэбнага года) праводзіцца ў адпаведнасці з “Палажэннем аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў студэнтаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце”, зацверджаным Загадам рэктара БДУ № 38-ОД ад 04.02.2008г., і складаецца:

- з вынікаў работы на практычных занятках (ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай);
- выканання кантралюемай самастойнай работы ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай);
- выканання пісьмовых работ (ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай).

Этапы засваення зместу вучэбнага матэрыялу фіксуюцца ў рэйтынгавай картцы.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. Сінтаксіс рускай мовы | Рускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 10 ад 24.06.2015 г. |
| 2. Гістарычны сінтаксіс беларускай мовы | Гісторыі беларускай мовы | няма | Зацвердзіць Пратакол № 12 ад 19.05.2015 г. |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры (пратакол № ____ ад ________ 2016_ г.)

Загадчык кафедры
_______________________ ________________ ___________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
__прафесар_______________ ________________ __І.С. Роўда_____________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча